**В. С. Забродская**

# ТВОР ПРЫНАГОДНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XVII стст. ЯК СРОДАК ЗАХАВАННЯ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

Папулярнасць прынагодная літаратура (у тым ліку творы, напісаныя з нагоды вяселляў) набыла на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага (пазней Рэчы Паспалітай) у другой палове XVI – першай палове XVII ст., што было абумоўлена дасягненнем адпаведнага ўзроўню культуры (людзі верылі ў тое, што паэтычнае слова і пісьмовы дакумент, дзе яно зафіксавана, з’яўляецца дзейсным сродкам фарміравання і перадачы памяці, плённа функцыянаваў інстытут мецэнацтва), адукацыі (многія магнаты ці шляхціцы ажыццяўлялі вандроўкі для набыцця ведаў ва адукацыйныя ўстановы Еўропы), а таксама развіцця ўсебаковых кантактаў эліты грамадства з прадстаўнікамі іншых краін.

Прынагодная літаратура азначанага перыяду была прадстаўлена (віншавальнымі творамі на шлюб); прывітальнымі вершамі, якія ствараліся з розных нагод (прыезду ў мясцовасць, абрання на пэўную пасаду, інаўгурацыі і г.д.).

Пералічаныя падзеі прыватнага (а ў той жа час і грамадскага) жыцця магнатаў і шляхты насілі як рытуальны, так і статусны характар. У сувязі з распаўсюджваннем кнігадрукавання гэта стала добрай магчымасцю пакінуць для нашчадкаў матэрыялізаваную версію цырымоніі ў выглядзе густоўна аздобленага друкаванага арт-аб’екта.

Асноватворным элементам светабудовы асобы з элітарнага кола была прыналежнасць да пэўнага знакамітага роду. Высакароднасць пацвярджалася наяўнасцю герба роду, які абавязкова змяшчаўся на адваротным баку тытульнага ліста прынагодных твораў і меў наступныя неад’емныя элементы: 1) назву *In Stemma...* ‘На герб’, *In arma illustris...* ‘На выяву герба…’; 2) ілюстрацыю герба героя твора – прадстаўніка знакамітага роду; 3) эпіграму (эмблематычны верш).

Мэтай твораў прынагоднай літаратуры ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. было віншаванне, прывітанне і ўсхваленне асобы і яе роду. Прызначэнне такіх твораў не абмяжоўвалася толькі апісаннем і паэтызацыяй цырымоній. Як складнік сацыяльнай культуры тэкст, напісаны да пэўнай

нагоды, спрыяў вырашэнню пытанняў прэзентацыі ключавых момантаў светапогляду прадстаўнікоў эліты: выяўлення каштоўнасных і маральных характарыстык герояў твораў, годных славы продкаў, дэманстрацыі велічы і старажытнасці родаў, богабаязнага і фундатарскага характару стаўлення да рэлігіі, адлюстравання гістарычнай памяці.

Паколькі прадстаўнік эліты прымаў актыўны ўдзел у жыцці краіны, ён выконваў пэўныя ролі, якія акрэслівалі адпаведную пазіцыю ў грамадскай супольнасці. Робячы акцэнты на яго грамадскую дзейнасць, аўтары прынагодных твораў стваралі яго сацыяльны партрэт. Так, з боку палітычнай сферы ён быў паказаны як абаронца Айчыны, палітык міжнароднага плана, мудры і мужны змагар. У сацыяльна-культурным жыцці ён – грамадскі дзеяч (прадстаўнік заканадаўчай, выканаўчай, судовай улады), заказчык у прафесійных творцаў прадметаў мастацтва, адукаваны патрон навучальных устаноў, удзельнік і арганізатар адукацыйных вандровак, які актыўна развіваў культурныя цэнтры на землях, якімі валодаў.

Прынагодныя творы, што напаўнялі бібліятэкі магнатаў і шляхты прадстаўлялі канкрэтныя падзеі прыватнага, а ў той жа час і грамадска-палітычнага, жыцця. Яны належалі і да ўтылітарнай сферы, і да мастацкай прасторы, спрыялі захаванню інфармацыі сацыякультурнага характару. Такім чынам, прынагодны твор як элемент візуалізацыі сямейнай (родавай – сацыяльнай) гісторыі спрычыніўся да фарміравання, замацавання і пашырэння культурна-гістарычнай памяці пра эліту Вялікага Княства Літоўскага другой паловы XVI – першай паловы XVII ст.